# ПЕЙЗАЖНЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ Ў РАСКРЫЦЦІ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У РАМАНЕ І. МЕЛЕЖА «ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ»

***Н. В. Шмігера***

**ГрДУ (Гродна)**

***Навук. кіраўн. – Т. А. Аляшкевіч, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца асаблівасць мележаўскай пейзажнай дэталі як аднаго з галоўных спосабаў раскрыцця ўнутранага стану персанажа. Вывучаецца непасрэдна цеснае ўзаемадзеянне пейзажных замалёвак у рамане і псіхалагічнай характарыстыкі жаночых вобразаў. Вызначаюцца асноўныя функцыі пейзажу ў раскрыцці характараў жанчын Палесся.

**Ключавыя словы:** пейзаж; дэталь; жаночы вобраз; унутраны стан.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Надзвычай многа работ прысвечана аналізу творчасці І. Мележа. Даследчыкі абсалютна з розных бакоў падыходзяць да раскрыцця шматграннай і цікавай асобы пісьменніка. А яго «Людзі на балоце» сталі не проста гімнам Палессю, а цэлай каштоўнай скарбонкай у раскрыцці беларускай культуры.

Пейзажныя дэталі займаюць адно з галоўных месцаў у творы. Дарэчы, пачынаецца раман з вялікага апісання наваколля вёскі Курані. Але за кожным штрыхом пейзажу хаваецца глыбінны сэнс. Як трапна заўважыў А. Б. Есін, «вяртаючыся ўласна да літаратурнага паказу прыроды, трэба сказаць яшчэ аб адной функцыі пейзажу, якую можна назваць псіхалагічнай. З даўніх часоў было заўважана, што пэўны стан прыроды так ці інакш суадносіцца з тымі ці іншымі чалавечымі пачуццямі і перажываннямі. Таму пейзажныя дэталі з самых ранніх этапаў развіцця літаратуры паспяхова выкарыстоўваліся для стварэння ў творы пэўнай эмацыянальнай атмасферы» [2, с. 81].

Вядома, што І. Мележ – гэта майстар мастацкай дэталі, майстар стварэння галерэі яркіх і запамінальных вобразаў, майстар пейзажных замалёвак. У дадзеным артыкуле мы звернем увагу на асаблівасць мележаўскай пейзажнай дэталі як

аднаго з галоўных спосабаў раскрыцця ўнутранага стану персанажа, паспрабуем паказаць пісьменніка менавіта як тонкага знаўцу таямнічай жаночай душы.

Прырода і жанчына яшчэ з даўніх вякоў успрымаліся як нейкае няяўнае адзінства. Нашыя продкі адчувалі гэтую неперарыўна-сакральную сувязь. Прырода-валадарніца дала жанчыне пачуццёвасць і інтымнасць, мудрасць і прыгажосць, пяшчоту і ласку. У свеце, хіба, больш і няма такой з'яднанасці нябачнай, але і непарушнай. «*Усё лета перад хатай Чарнушкаў ціха грэлася на сонцы маладзенькая, з тонкім, як дубец, камлём рабіна. Ніхто ў Куранях, бадай, не заўважыў, калі і хто пасадзіў яе, не бачылі як трэба яе і тады, калі яна красавіцкай раніцай апранулася ў лёгкае празрыста-зялёнае плацце з кволых, рэзных лісточкаў. Дні за днямі цікаўна, але нясмела глядзела яна на вуліцу, на ўсіх, хто праходзіў міма, – сціплая, непрыкметная, за нязграбным плотам, блізка ад вялікіх дрэў. Ніхто не даваў ёй ніякай увагі, мылі яе, песцілі толькі цёплыя дажджы ды любілі шумець маладым лісцем вятры…*

*Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна. Яшчэ, здаецца, учора была гарэза, падлетак, а вось ужо, глядзіце – у самай добрай пары дзяўчына, у самай красе сваёй! Калі толькі вырасла!*» [4, с. 23]. Надзвычай цікава і непаўторна знаёміць нас І. Мележ з галоўнай гераіняй рамана – Ганнай Чарнушкай. «Гэта зусім натуральна, што І. Мележ з такой пяшчотай апісвае Ганну. Менавіта яна была самым улюбёным героем яго твораў, яна надзвычай была падобна да яго жонкі. Пісьменнік аддаў ёй багата свайго, запаветнага, таго, што некалі было пераўжыта ім самім» [1, с. 153].

У літаратуры можна знайсці шмат параўнанняў жаночых вобразаў з раслінным светам. У фальклоры асобныя дрэвы маюць выразную жаночую сімволіку, напрыклад, каліна, бяроза, ліпа. І. Мележ абірае рабіну. Безумоўна, аўтар зрабіў гэта зусім невыпадкова. Рабіна – прыгожая заўсёды. Увесну – белымі кветкамі, увосень – чырвонымі ягадамі. Яна – сімвал жаночай долі – спачатку нявесты, потым маладой жанчыны. Чырвоны колер ягад звязвае гэтае дрэва ў народнай свядомасці з ахоўнай магіяй. Рабіну ўпляталі ў вянкі на Купалле, упрыгожвалі хаты на Сёмушным тыдні, асвячалі на Тройцу і інш. Рабіна «падаравала» Ганне незвычайную прыгажосць, прывабнасць, але не толькі знешнюю, а і ўнутраную, душэўную. «*Ціхая, нявідная, у жнівеньскім росквіце рабіна заружавела, зазырчэла яркім, кідкім харастовм, гарачым полымем агністых гронак*» [4, с. 23]. Разам з тым вобраз рабіны ў традыцыйнай карціне свету беларусаў даволі супярэчлівы. У фальклоры ягонае паходжанне звязваецца з гаротным лёсам жанчыны, якая і сталася рабінай. Горыч рабінавых ягад, як ніщто іншае, перадае, падказвае, прадчувае горкі дзявочы лёс. А чырвоныя ягады рабіны – гэта не толькі прыгажосць Ганны, гэта, згодна з легендай, крывавыя слёзы Евы, выгнанай з раю. На працягу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўсяго рамана яшчэ неаднойчы мы ўспомнім «*маладзенькую, пад шумнымі вятрамі*» рабіну. Тым самым аўтар падкрэслівае яе незалежную і непакорную натуру, якая спрабуе змагацца з гаротнай доляй.

Але, здаецца, І. Мележ цалкам раскрыўся як майстар пейзажнай замалёўкі пры стварэнні вобраза Хадоські. Яе чыстай чуллівасці, непадробнай жаноцкасці, пранікнёнасці да ўсяго свету, шчырасці, пачуццёва-эмацыянальнай душы. Яна, як ніхто іншы ў рамане, адчувала кожную прыродную змену, але і прырода мянялася ад кожнага руху душэўных перажыванняў Хадоські. Асабліва ярка гэтая з'яднанасць паказваецца пісьменнікам у той момант, калі Хадоська ідзе, а потым вяртаецца ад знахаркі: «*Яна пайшла цішэй. Які непрыветны дзень, які нядобры гэты голы, чорны балотны хмызняк! Густая, халодная вада ў рэчцы, трава, памерзлая, мокне ў вадзе. Аж самой холадна робіцца. Холадна і непрытульна. Думаць не хочацца, нічога не хочацца... «Не пайду к вядзьмарцы... Грэх – у вядзьмаркі...»*

*Адразу, як ступіла на прагаліну, пачула, як апала, зазыбалася пад нагамі дрыгва – вось-вось правецца…*

*Ну, от і ўсё. Зараз... Там, за чаротам... А чарот – перад тварам... Крок, яшчэ крок... Цішыня якая. Нідзе ні душы... Ніхто ведаць не будзе... «Не памінайце ліхам, мамачко, татко!.. Не карай, Божачко, ты бачыш, іначай няможно!..» Ішла, як у сне, праваліліся адной нагой па калена, ледзь утрымалася на купіне, пасунулася далей…*

*Яна кранулася, яшчэ не цямячы нічога. Чула, што хтосьці глядзіць услед, баялася азірнуцца. Страх поўніў усю яе, але яна ішла. Дрыгва апаўзала, гнулася, трашчала, Хадоська ніяк не думала пра тое, што можа праваліцца. Чула за сабой толькі страшнае, што цягнула ў глыбінь...*» [4, с. 341].

Дадзеная карціна намалявана трапнымі лаканічнымі шрыхамі, якія ствараюць ілюзію пранікнення ў нешта таямнічае, невядомае чалавечаму воку. Праз безліч шматкроп'яў, кароткіх сказаў, якія выкарыстоўваюцца з мэтай адлюстравання хуткасці руху, паказу разнастайнасці акаляючай рэчаіснасці. Аўтар наўмысна выкарыстоўвае пэўную недасказанасць, замоўчванне, стварае нябачныя рыскі-замалёўкі, каб чытач змог сам уявіць і пранікнуць у дадзеную сітуацыю. З дапамогай перарывістай інтанацыі ўзнікае сапраўднае адчуванне таго страху, трымцення душы маладой дзяўчыны, якая ідзе на вялікі грэх, супраць Бога. Яна, што павінна даваць жыццё, нараджаць і ахоўваць, па наканаванні лёсу, ідзе на забойства. Прырода нібы адчувае яе бяду, з якой яна засталася сам-насам.

Пры ўсім гэтым немагчыма не звярнуць увагу на надзвычай важную расліну, якая ў дадзенай пейзажнай замалёўцы нясе ў сабе глыбінна-сакральны сэнс. Паводле хрысціянскай сімволікі, чарот сімвалізуе вернікаў, якія вядуць сціплае жыццё, а таксама гэта сімвал паслухмянасці. Акрамя таго, калі немаўля Майсей быў знойдзены ў зарасніках

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чароту, гэту расліну сталі звязваць з месцам, з якога прыйшло выратаванне. Менавіта такім месцам выратавання і быў лес, дзе рос той чарот, для бяссільнай і змучанай Хадоські. Хадоські, якая не ведала іншага выйсця, – толькі адзіны выбар, толькі адзіны шлях.

Гаворачы пра вялікую з'яднанасць прыроды і жанчыны, немагчыма не заўважыць яшчэ адну гераіню – знахарку. У рамане «Людзі на балоце» яна з'яўляецца толькі аднойчы, можам нават аднесці яе да другасных персанажаў у творы. Жанчына, як носьбіт і прадаўжальніца паганства, дапамагае Хадосьцы ў яе душэўных муках. Гаспадыня зямнога дому – прырода дала знахарцы магчымасць лячыць і ратаваць: «*Загад такі выйшаў, кеб усіх, каторыя нутром нядужыя, пераводзіць. Кеб, значыць, папсаваных не було. Усё адно як каторы нядужы саусім, той і не чалавек! Я унь колькі такіх хворых вылечыла, жывуць ды бога і мяне хваляць*» [4, с. 345]. Захарыха давала жыццё, не столькі фізічнае, колькі больш важнае, духоўнае.

Разам з тым прырода ў рамане з'яўляецца і так званым фонам, на якім раскрываецца характар героя. Жанчына-паляшучка, маці Васіля, увесь час знаходзіцца ў працы, у штодзённым з'яднанні з прыродай. У такім выпадку перад намі паўстае гаспадыня на сваёй зямлі, гаспадыня Дому. Упершыню пазнаёміліся з ёй, калі яна пашкадавала будзіць хлопца, але ўжо рыхтавалася да ад'езду на касьбу. Яна, маці, з улюбёнасцю і пяшчотай назірае за сынам. Наогул Дзятліха вызначаецца маўклівасцю, паслухмянасцю, лагоднасцю і нейкай нават вінаватасцю. І. Мележ з прыхаванай замілаванасцю паказвае ўсе яе душэўныя перажыванні, ды і сама прырода ў гэты момант нeяк заціхае: «*На Васілёвым двары было ціха, пуста, сумна. Сумнай выглядала і хата, што маўкліва чарнела ў змроку, – ні гаворкі ў ёй, ні святла ў вокнах*» [4, с. 61].

Зямля, прыроднае багацце адорвае не толькі пачуццёвасцю і чуллівасцю да наваколля, але і ўсё ж такі даечалавеку хлеб надзённы. Працай жанчына жыве ўвесь час, вечным клопатам пра дабрабыт, а прырода побач, як найбліжэйшая сястра, нябачна пашкадуе і падтрымае. Можна нават заўважыць, што прырода ў рамане «Людзі на балоце» выступае асобнай гераіняй, мудрай сяброўкай усіх жанчын твора.

Звярнуўшыся толькі да некалькіх пейзажных замалёвак, немагчыма не адчуць непаўторны мележаўскі стыль пісьма, адметнасць яго дэталі. Чытаючы І. Мележа, мы заўважаем, як ён уважліва ўглядаецца ў жыццё вёскі Курані: шырока ахоплівае рэчаіснасць і ў той жа час умее ўлавіць самыя маленечкія яе рыскі. «Палескія пейзажы ў Мележа вызначаюцца багаццем фарбаў, гукаў, настрояў. Яны то гучаць лірычна, то ствараюць частку эпічнага палатна. Карціны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыроды то даюцца праз аўтарскае апісанне, то праз успрыманне станоўчага героя. Гэта чаргаванне паглыбляе эмацыянальнае ўздзеянне пейзажнага малюнка на чытача. Карціны прыроды ў рамане сагрэты сыноўскай любоўю пісьменніка да роднай зямлі» [3, с. 111]. У кожнай дэталі закладзена вялікая каштоўнасная думка, якую аўтар выказаў з выкарыстаннем мінімальных слоўных вобразаў. І. Мележ заклаў глыбінны эмацыянальна-эстэтычны сэнс, дзякуючы якому з’явіліся цэласныя жаночыя вобразы беларусскага Палесся.

Пейзажныя дэталі, звязаныя з вобразамі жанчын, выконваюць у рамане дзве асноўныя функцыі: па-першае, удзельнічаюць у апісанні іх знешнасці; па-другое, пейзаж стварае ў творы неабходную атмасферу, якая акампаніруе ўнутранаму стану гераінь. Пейзажныя замалёўкі-дэталі ў рамане ў сваёй большасці эмацыянальна-сэнсавыя, яны вартасныя не самі па сабе, а тымі думкамі і пачуццямі, якія нараджаюцца ў чытача ў адносінах да жанчын-гераінь. Гэтым дасягаецца незвычайнае ўнутранае адзінства ўсяго раманнага палатна, максімальная пластычнасць вобразаў-персанажаў. Пейзажныя дэталі апелююць да чытацкай фантазіі, робяць чытача ўдзельнікам творчага працэсу пры стварэнні цэльнай мастацкай карціны ў рамане.

## *Літаратура*


1. Бугаёў, Д. Вернасць прызнанню: творчая індывідуальнасць Івана Мележа / Д. Бугаёў. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 240 с.
2. Есин, А. Б. Принципы и приемы анализа литературного произведения : учеб. пособие / А. Б. Есин. – 9-е изд. – М. : Флинта : Наука, 2008. – 248 с.
3. Ляшук, В. Я. Іван Мележ у школе : дапаможнік для настаўніка / В. Я. Ляшук. – Мінск : Народная асвета, 1981. – 126 с.
4. Мележ, І. П. Людзі на балоце : раман з «Палескай хронікі» / І. П. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1971. – 381 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ